НЯХАЙ ЖЫВЕ МАРКСІЗМ-ЛЕНІНІЗМ—ВЕЧНА ЖЫВОЕ ІНТЭРНАЦЫЯНААЛЬНАЕ ВУЧЭН НЕ, ПУЦЯВОДНАЯ ЗОРКА ПРАЦОЎНЫХ УСІХ КРАІН У БАРАЦЬБЕ ЗА ПЕРАМОГУ САЦЫЯЛІЗМА І КАМУНІЗМА!

(З ЗАКЛІКАЎ ЦК КПСС ДА 51-й ГАДАВІНЫ ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ).

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 28 (719) Пятніца, 18 кастрычніка 1968 г. Год выдання XXI Цана 2 кап.

Плённая садружнасць звязвае нашых вучоных і рабочых вучэбна-вытворчых майстэрань. Дзякуючы ёй, нарадзілася шмат арыгінальных прыбораў і прыстасаванняў, не адно вынаходства атрымала пуцёўку ў жыццё, знайшло прымяненне ў лабараторыях, дэманстравалася на лекцыях і дапамагала студэнтам на практычных занятках.

Умелыя рабочыя рукі і кемлівасць даюць рэчавае ўвасабленне самай смелай навуковай думкі і разліку.

На здымку: (злева направа) вучэбны майстар К. І. Аўтушка, галоўны інжынер лабараторыі кафедры электрафізікі І. Г. Ляонаў і механік Ю. Р. Елісееў правяраюць сканструяваную ўстаноўку для выяўлення дэфектаў у тонкім дроце.

Фота Г. МАРОЗАВА.

УДАСКАНАЛЬВАЦЬ СВАЮ ІДЭЙНУЮ ЎЗБРОЕНАСЦЬ

Новы навучальны год у сетцы партыйнай асветы, які пачаўся 1 кастрычніка, будзе праходзіць пад знакам больш паглыбленага вывучэння ленінскай тэарэтычнай спадчыны і ідэйнага вопыту нашай партыі ў сувязі з набліжэннем 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Падзеі апошніх год асабліва яскрава прадэманстравалі вялікае значэнне ідэалагічнай барацьбы ў класавым канфлікце пралетарыята і буржуазіі, сацыялізма і капіталізма, якая вызначае развіццё сучаснага свету. Імперыялістычныя сілы выкарыстоўваюць самы нязначны пралом у ідэйных пазіцыях пралетарыята, каб падарваць рабочае адзінства. Яны робяць стаўку на нацыяналістычныя, рэвізіяністскія і лявацкія элементы, спадзеючыся з іх дапамогай прытупіць класавую свядомасць пралетарыята.

У гэтых умовах узрастае зацікаўленасць савецкіх людзей да актуальных праблем палітычнай і ідэалагічнай барацьбы і разам з тым ускладняюцца задачы партыйнай прапаганды.

Камуністы універсітэта з году ў год накопліваюць і ўдасканальваюць вопыт арганізацыі партыйнай вучобы. У 1968-69 навучальным годзе ва універсітэце будзе працаваць 25 праблемных і тэарэтычных семінараў. Сярод іх семінары па філасофскіх праблемах прыродазнаўства, агульнафілософскія семінары, семінары па праблемах літаратуры і лінгвістыкі, семінары, якія ахопліваюць праблемы развіцця сучасных зарубежных дзяржаў і міжнародных адносін і г. д.

Галоўная мэта тэарэтычных і праблемных семінараў заключаецца ў тым, каб цясней звязаць вывучэнне рэвалюцыйнай тэорыі з задачамі навукова-творчай і педагагічнай работы. Рашэнню гэтай задачы садзейнічае фарміраванне семінараў пераважна на базе факультэтаў і кафедр, што дазваляе аб'яднаць у семінары спецыялістаў, якія працуюць у адной навуковай галіне. Выключэннем толькі з'яўляецца семінар па філасофскіх праблемах прыродазнаўства, якім кіруе прафесар В. І. Сцяпанаў. На працягу многіх год ён уключае ў састаў семінара вядучую групу вучоных універсітэта з ліку фізікаў, матэматыкаў і хімікаў.

У новым навучальным годзе павінна расшырыцца кола вывучаемых у семінарах твораў У. І. Леніна. Праграма семінараў павінна набыць больш баявы палітычны характар, больш увагі неабходна ўдзяліць крытыцы філасофскіх уяўленняў, якія бытуюць у замежнай буржуазнай навуцы, і барацьбе з наўмыснай фальсіфікацыяй і дыверсіяй.

Шырэй неабходна прымяняць вопыт правядзення сумесных заняткаў некалькіх праблемных семінараў вучоных розных спецыяльнасцей для абмеркавання праблем, якія знаходзяцца на стыку розных навук. Праграму работы праблемных семінараў па прыродазнаўству часам неабходна было б папаўняць аналізам важнейшых падзей унутранага і міжнароднага жыцця.

Партыйныя бюро факультэтаў павінны паўсядзённа кіраваць справай партыйнай асветы, забяспечваючы нармальную работу семінараў і актыўны ўдзел у іх навуковых супрацоўнікаў факультэтаў.

Л. ШНЕЕРСОН,
прафесар, член парткома.

НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

24—26 кастрычніка ў нашым універсітэце адбудзецца арганізаваная Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі сумесна з БДУ навукова-метадычная канферэнцыя па грамадскіх навуках.

На пленарных пасяджэннях і ў секцыях будзе заслухана і абмеркавана звыш 40 дакладаў. Намечана разгледзець шырокае кола пытанняў ад ролі кафедры ў павышэнні тэарэтычнага ўзроўню і метадычнага майстэрства выкладчыкаў да шляхоў удасканалення аспірантуры. Шэраг дакладаў спецыяльна прысвячаецца завочнаму і вячэрняму навучанню, вопыту арганізацыі самастойнай работы студэнтаў, значэнню лекцый, кансультацый і семінарскіх заняткаў у працэсе навучання.

На канферэнцыі будуць працаваць чатыры секцыі: гісторыі КПСС, палітычнай эканоміі, філасофіі і гісторыі філасофіі і навуковага камунізма.

НОВЫЯ СТУДЭНЦКІЯ ТРАДЫЦЫІ

«ХРЫШЧЭННЕ» ПЕРШАКУРСНІКАЎ

Студэнцкія традыцыі — новыя, цікавыя, карысныя— складваюцца на нашых вачах. Ужо некалькі гадоў запар на філалагічным факультэце праводзіцца вясёлае, поўнае іскрыстага гумару свята «хрышчэння» першакурснікаў — пасвячэння іх у студэнты. Сёлета яно выпала на апошні дзень другога студэнцкага працоўнага тыдня.

...Актавая зала ўпрыгожана гумарыстычнымі плакатамі-настаўленнямі. За сталом прэзідыума — урачыста-усхваляванае факультэцкае начальства, старэйшыя выкладчыкі факультэта. Праходзіць хвіліна чакання, і дэкан Аляксей Арсенцьевіч Волк адкрывае свята:

— Я думаю, што гэтыя хвіліны запамятаюцца вам назаўсёды, дарагія першакурснікі. Студэнцкія білеты, якія вы сёння атрымаеце, не толькі даюць права заходзіць у чытальні, атрымліваць кнігі ў бібліятэках, ездзіць за паўкошт па чыгунцы, але і накладваюць на вас вялікі абавязак: усюды і заўсёды берагчы гонар Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Не забывайце гэта!

Шчыра, ад усёй душы прывіталі студэнтаў дацэнт Маргарыта Барысаўна Яфімава і прафесар Міхась Рыгоравіч Ларчанка. Прывіталі не па абавязку, не казённа-суха; адчувалася, што выкладчыкам сапраўды радасна бачыць на факультэце новае папаўненне, сапраўды дарагі лёс кожнага навічка. А затым... Затым студэнтаў-першакурснікаў пачалі вітаць іх старэйшыя сябры: «трыо» студэнтаў другога курса аддзялення рускай мовы і літаратуры — песняй, «квінтэт» іх калег з беларускага аддзялення — невялікім сцэнічным мантажом з уласных вершаў. Аддзяленне беларускай мовы і літаратуры нездарма завуць паэтычным — гэта адчулася і на свяце, асабліва тады, калі на сцэну выйшлі «ветэраны» — пяцікурснікі. Сяргей Законнікаў падараваў першакурснікам «гарачанькія», толькі што напісаныя з выпадку гэтай урачыстасці радкі:

Дзень добры вам, сыны і дочкі
Зямлі азёрнай і лыняной!
Гляджу на вашы твары, вочы—
Уся Беларусь перада мной!
З Бягомля, Стоўбцаў, Ваўкавыска
Прыйшлі вы ў гэты мудры храм,
І хоць з часоваю праліскай—
Я рад, што змена ёсць і нам.

Ды што казаць, мы маладзеем,
Як кінем погляд вам услед.
У нас няма такой надзеі,
А перад вамі — цэлы свет.
А перад вамі — рой дацэнтаў,
А аспірантаў — проста цьма.

Філалагіні, свае сэрцы
Не аддавайце проста так,
Бо з веку ў век у нас пасецца
Матфак, фізфак і біяфак.
Каб не сказалі: «Што ты вучыш!»—
Каб сум не засціў вам галоў,

(Працяг на 3-й стар.).

Камуністы абмяркоўваюць вынікі мінулага года

ВЫХОЎВАЦЬ ДАСТОЙНУЮ ЗМЕНУ

Днямі адбыўся агульнаўніверсітэцкі партыйны сход. З дакладам «Вынікі 1967-1968 навучальнага года і задачы камуністаў БДУ па далейшаму ўдасканаленню вучэбна-выхаваўчай работы ў новым навучальным годзе» выступіў прарэктар па вучэбнай рабоце Сцяпан Андрэевіч Умрэйка.

Ніжэй мы друкуем матэрыялы з дакладу і выступленняў камуністаў.

Новы навучальны год распачаўся ў абставінах дзейснай падрыхтоўкі да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, 50-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі і слаўнага юбілею Ленінскага камсамола.

Калектыў універсітэта нямала робіць для падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў, для выхавання іх пераканаными барацьбітамі за ідэалы камунізма.

Вынікі 1967—68 навучальнага года сведчаць аб тым, што на кафедрах усё часцей абмяркоўваюцца такія дыдактычныя і навукова-метадычныя пытанні, як навуковасць і марксісцка-ленінская ідэйнасць у выкладанні, шляхі здзяйснення сувязі тэорыі з практыкай, практычнага вопыту з навукай, пытанні развіцця пазнавальнай дзейнасці студэнта, г. зн. яго свядомасці, актыўнасці і самастойнасці ў вучобе. Некаторыя калектывы кафедр плённа шукаюць шляхі злучэння індывідуальнага пошуку ведаў з вучэбнай работай. Гэта станоўча адбіваецца на ўзроўні тэарэтычных ведаў і практычных уменняў студэнтаў, на іх агульнай і спецыяльнай падрыхтоўцы. У цэлым выпускнікі нашага універсітэта паспяхова спраўляюцца з работай на заводах і прадпрыемствах, у навукова-даследчых і вучэбных установах.

Але нельга сцвярджаць, што ва універсітэце ўжо вырашаны ўсе задачы зладжанай арганізацыі вучэбна-выхаваўчай работы, што ў нас няма недахопаў. На жаль, у рабоце дэканатаў і кафедр вельмі многа істотных прабелаў. Для пацвярджэння гэтага дастаткова спаслацца на вынікі экзаменацыйнай сесіі і вынікі дзяржаўных экзаменаў.

Да пачатку вясенняй экзаменацыйнай сесіі ва універсітэце на стацыянары вучылася 6995 студэнтаў, з'явіліся на экзаменацыйную сесію — 6726, здалі экзамены па ўсіх прадметах — 5995, у тым ліку: на выдатна — усяго толькі 959 (або 13,7 працэнта), на выдатна і добра 2340 (або 33,4 працэнта), на здавальняюча 2696 (або 38,5 працэнта), атрымалі нездавальняючыя адзнакі 711 чалавек (або 14,4 працэнта).

Усе атрымаўшыя нездавальняючыя адзнакі—камсамольцы. Большасць атрымаўшых нездавальняючыя адзнакі — студэнты I—III курсаў — 678 чалавек. З гэтай колькасці 318 чалавек— студэнты першых двух курсаў. Але ёсць студэнты і IV—V курсаў, якія атрымалі дрэнныя адзнакі па экзаменах.

Найбольшую колькасць выдатных і добрых адзнак атрымалі студэнты хімічнага факультэта (62 працэнты), філалагічнага (60 працэнтаў), гістарычнага (57 працэнтаў), біялагічнага і фізічнага (55 працэнтаў), і вельмі многа нездавальняючых адзнак на матэматычным факультэце (21 працэнт), журналістыкі (19 працэнтаў), геолага-геаграфічным факультэце (19 працэнтаў).

У цэлым па універсітэту 14 працэнтаў студэнтаў — непаспяваючыя, вучацца здавальняюча — 44 працэнты. Такім чынам, больш паловы студэнтаў засвойваюць вучэбны матэрыял толькі на здавальняюча або маюць нездавальняючыя адзнакі.

Як жа засвойваюць вучэбную праграму камуністы? З 229 студэнтаў-камуністаў здалі ўсе экзамены па ўсіх прадметах вучэбнага плана 211 чалавек, і 18 з іх атрымалі нездавальняючыя адзнакі. Каля палавіны непаспяваючых складаюць студэнты - камуністы гістарычнага факультэта.

Цікава прааналізаваць вынікі вясенняй экзаменацыйнай сесіі на вячэрнім аддзяленні факультэтаў.

З агульнага ліку дапушчаных да здачы экзаменаў 2846 чалавек 189 увогуле не з'явіліся на экзамены, з іх больш палавіны без уважлівых прычын. Са здаваўшых экзаменацыйную сесію 2657 чалавек прыкладна трэцяя частка атрымала дрэнныя адзнакі, а на вячэрнім аддзяленні факультэта журналістыкі маюць дрэнныя адзнакі каля 40 працэнтаў студэнтаў, каля 30 — на філалагічным, фізічным факультэтах. На філалагічным і біялагічным факультэтах адна чвэрць студэнтаў увогуле не з'явілася на сесію без уважлівых прычын.

Слаба прыкавана ўвага пярвічных партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый факультэтаў да пытанняў пастаноўкі вучэбнай работы. Нават пры абмеркаванні на факультэтах вучобы студэнтаў звычайна выступаюць з заўвагамі і прапановамі камуністы і асобныя выкладчыкі, але не самі студэнты, яны стаяць у баку. Вось чаму пасіўныя адносіны да вучэбных заняткаў з боку многіх студэнтаў не сустракаюць рэзкага асуджэння іх таварышаў па курсу і групе, не ствараюцца невыносныя абставіны ў калектыве для тых, хто не выконвае сваіх прамых абавязкаў.

Сур'ёзны ўрон усёй пастаноўцы вучэбнай работы наносіць недастатковая арганізаванасць і праяўленне недысцыплінаванасці студэнтаў. У 1967-68 навучальным годзе студэнтамі прапушчаны многія тысячы гадзін вучэбных заняткаў без уважлівых прычын, прычым некаторыя студэнты самі ўстанавілі для сябе свабоднае наведванне лекцый і практычных заняткаў. Ужо і ў гэтым годзе працягваецца практыка не з'яўлення або спазнення на заняткі. Напрыклад, 4 кастрычніка гэтага года чыкаў кафедр і дэканатаў. Калі тры гады таму назад было запісана на магнітафонную стужку і застэнаграфіравана 32 лекцыі па універсітэту, то ў 1967-68 навучальным годзе такая форма кантролю і метадычнай дапамогі ўвогуле адсутнічала.

Як ужо адзначалася, найбольш нізкая паспяховасць падае на першыя і другія курсы, прычым на першых курсах, як ні дзіўна, не паспяваюць нават многія медалісты. Напрыклад, з 647 медалістаў, прынятых у 1967 годзе, у зімнюю сесію атрымалі нездавальняючыя адзнакі па аднаму і больш прадметах 100 чалавек і ў вясеннюю сесію — 75. Гэта даволі высокі і трывожны працэнт непаспяховасці. Больш таго, з 267 чалавек, выключаных з універсітэта ў 1967-68 навучальным годзе, 247 — студэнты першага і другога курсаў. Тлумачыцца гэта не тым, што нібыта першакурснікі не хочуць вучыцца або дрэнна падрыхтаваны ў школе, а тым, што яны трапілі ў новыя абставіны і не могуць адразу пераключыцца на спецыфічныя метады работы вышэйшай школы, якія рэзка адрозніваюцца ад метадаў сярэдняй школы.

Далей дакладчык гаворыць аб недахопах у пастаноўцы метадычнай работы ва універсітэце, у прыватнасці аб адсутнасці метадычных саветаў на факультэтах, недастатковай метадычнай дапамозе маладым выкладчыкам, недакладным рэгуляванні нагрузкі.

Сістэматычная работа студэнта, гаворыць С. А. Умрэйка, часта парушаецца залікамі па тэарэтычных курсах. Такія залікі праводзяцца ў той час, калі ідуць заняткі па другіх дысцыплінах. У выніку прадмет, па якому праводзіцца залік, і іншыя дысцыпліны засвойваюцца дрэнна.

ЦК КПСС. Па гэтаму плану праведзены і студэнцкія канферэнцыі. Кафедры грамадскіх навук часцей сталі практыкаваць правядзенне аб'яднаных нарад-семінараў выкладчыкаў некалькіх кафедр з мэтай каардынацыі іх намаганняў у галіне вучэбна-выхаваўчай работы, распаўсюджання перадавога вопыту.

У апошнія гады рэктарат і партыйны камітэт універсітэта многа ўдзяляюць увагі распрацоўцы навукова абгрунтаванай сістэмы выхаваўчай работы, перспектыўнаму яе планаванню. Удасканальваць ідэйнае выхаванне студэнцкай моладзі цяпер немагчыма без навуковага падыходу да яго пастаноўкі. У мінулым навучальным годзе быў складзен перспектыўны план вучэбна-выхаваўчай работы, разлічаны на ўвесь перыяд навучання студэнта ад першага да пятага курса. У ім вызначаны асноўныя напрамкі фарміравання ў студэнтаў навуковаматэрыялістычнага светапогляду, працоўнага, маральнага, эстэтычнага і фізічнага выхавання. Дэканаты і некаторыя кафедры ўжо ў мінулым годзе на аснове перспектыўнага плана універсітэта спланавалі сваю работу і дасягнулі істотных поспехаў.

Разам з тым у выхаваўчай рабоце ў нас многа істотных прабелаў. Пацвярджэннем гэтага з'яўляецца хоць бы тое, што ў 1967-1968 навучальным годзе выключана з БДУ 19 студэнтаў за розныя правіннасці. Усяму калектыву універсітэта патрэбна сістэматычна і настойліва весці ідэйна-выхаваўчую работу, праяўляць пільнасць і тэарэтычную загартоўку ў ацэнцы ўсіх з'яў вучобы, жыцця і побыту студэнтаў і супрацоўнікаў. Трэба, каб часцей саветы факультэтаў і ўсе без выключэння кафедры абмяркоўвалі пытанні выхаваўчай работы. Арганізуючым цэнтрам і накіроўваючай сілай павінны быць пярвічныя партыйныя і камсамольскія арганізацыі.

Гаворачы аб павышэнні якасці вучэбнай работы універсітэта, неабходна звярнуць увагу на вячэрняе і завочнае навучанне. Не сакрэт, што ўсё яшчэ адчуваецца сур'ёзны разрыў ва ўзроўні і якасці падрыхтоўкі спецыялістаў па завочнай і вячэрняй форме навучання. Значная частка завочнікаў і вячэрнікаў паранейшаму выяўляе слабую тэарэтычную падрыхтоўку. Асабліва нізкая паспяховасць на матэматычным аддзяленні завочнага факультэта. У 1967-68 навучальным годзе ні адзін з прафесараў і загадчыкаў кафедр матэматычнага факультэта не меў вучэбных даручэнняў па завочнаму факультэту.

У заключэнне дакладчык спыніўся на планаванні і выкананні аб'ёму вучэбнай работы.

Характарызуючы пачатак новага навучальнага года, С. А. Умрэйка назваў цікавыя лічбы: на стацыянарнае аддзяленне прынят 1861 студэнт, 52 працэнты з іх — дзеці калгаснікаў і рабочых. Новае папаўненне вячэрняга аддзялення завочнага факультэта складае 2000 студэнтаў.

Ва універсітэце працуе вялікі і высокакваліфікаваны калектыў выкладчыкаў, авангардную ролю ў якім адыгрывае партыйная арганізацыя, якая налічвае больш 800 камуністаў. Каб значна павысіць узровень вучэбна-выхаваўчай работы, узброіць студэнтаў глыбокімі і грунтоўнымі тэарэтычнымі ведамі, уменнямі і практычнымі навыкамі, падкрэсліў камуніст С. А. Умрэйка, усім нам неабходна павысіць пачуццё адказнасці за навучанне і выхаванне моладзі, за сваю работу. Тады мы з новымі і больш значнымі поспехамі сустрэнем 50-годдзе БССР і КПБ і 100-годдзе з дня нараджэння вялікага Леніна.

х х х

У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел дэканы факультэтаў А. А. Гусак, Ф. М. Капуцкі, П. З. Савачкін, Р. В. Булацкі, сакратар партарганізацыі філалагічнага факультэта В. А. Захарава, сакратар камітэта камсамола універсітэта М. Ціва.

А. А. Гусак расказаў аб выкананні сацыялістычных абавязацельстваў, узятых калектывам матэматычнага факультэта ў гонар 50-годдзя БССР і КПБ і 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна.

А. А. Гусак выказаў думку аб неабходнасці стварэння на буйных факультэтах вучэбных частак.

Дэкан факультэта журналістыкі **Р. В. Булацкі** узняў пытанне аб матэрыяльнай базе, адзначыў, што на факультэце востра адчуваецца недахоп вучэбнай плошчы, адсутнічае неабходнае абсталяванне для нармальнага правядзення практыкі студэнтаў.

Сакратар камітэта камсамола **М. Ціва** падкрэсліў вялікую ролю факультэцкіх партыйных арганізацый у кіраўніцтве камсамолам.

Аб рабоце партыйнай арганізацыі філалагічнага факультэта са студэнтамі расказала **В. А. Захарава.**

Дэкан хімічнага факультэта **Ф. М. Капуцкі** гаварыў аб недахопах выкладання раду дысцыплін, адзначыў арганізацыйныя недахопы навучальнага працэсу. Ф. М. Капуцкі падтрымаў ідэю стварэння на факультэтах вучэбных частак. Ён зрабіў папрок камсамольскай арганізацыі, адзначыў, што пытанні паспяховасці ўсё больш рэдка абмяркоўваюцца на камсамольскіх сходах.

П. З. Савачкін, дэкан гістарычнага факультэта, звярнуў увагу на работу метадычных камісій.

Гаворачы аб рабоце калектыву, П. З. Савачкін адзначыў, што на факультэце ёсць вялікая партыйная арганізацыя, шмат студэнтаў-камуністаў, аднак, не ўсе актыўна працуюць. Ёсць аспіранты-камуністы, якія не звязаны з факультэтам і не маюць партыйных даручэнняў.

У прынятай сходам пастанове завострана ўвага партыйнай арганізацыі на актуальных пытаннях вучэбнай і выхаваўчай дзейнасці выкладчыцкага калектыву. Вызначаны канкрэтныя шляхі па паляпшэнню паспяховасці студэнтаў і павышэнню ўсёй ідэйна-выхаваўчай работы.

КАМУНІСТЫ! БУДЗЬЦЕ Ў АВАНГАРДЗЕ БАРАЦЬБЫ ЗА ВЫКАНАННЕ РАШЭННЯЎ XXIII З'ЕЗДА КПСС, ЗА ДАТЭРМІНОВАЕ ВЫКАНАННЕ ПЯЦІГАДОВАГА ПЛАНА, БУДЗЬЦЕ ЎМЕЛЫМІ АРГАНІЗАТАРАМІ І ВЫХАВАЦЕЛЯМІ МАС, ЗМАГАРАМІ ЗА ЎСЁ ПЕРАДАВОЕ!

(З ЗАКЛІКАЎ ЦК КПСС ДА 51-Й ГАДАВІНЫ ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ.)

Навуковы супрацоўнік лабараторыі кафедры фізічнай оптыкі Людміла Паўлаўна Суганяк пад кіраўніцтвам дацэнта І. П. Зяцькова паспяхова даследуе тайны палімераў.

На здымку: Л. П. Суганяк праглядае спектраграму.

Фота Г. МАРОЗАВА.

КАЛІ ПАЧЫНАЕЦЦА ДАСЛЕДЧЫК?

Да вынікаў другога Рэспубліканскага конкурсу студэнцкіх прац па праблемах грамадскіх навук, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху.

ВІНШУЕМ ПЕРАМОЖЦАЎ!

Па рашэнню калегіі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР і Бюро ЦК ЛКСМБ узнагароджваюцца студэнты універсітэта, працы якіх аднесены да першай катэгорыі:

I. **Каштоўнымі падарункамі Міністэрства і ЦК ЛКСМБ**—С. Абуладзе, А. Каракін, Л. Ніціеўская, А. Тозік, Л. Трухава, Я. Яловічава.

II. **Граматамі Міністэрства** — Н. Абрамава, Л. Анціпіна, С. Абуладзе, А. Багачоў, А. Байчараў, М. Віннікаў, А. Залатухін, А. Злотнікаў, В. Колесаў, Л. Ніціеўская, А. Селязнёва, Л. Трухава, Ю. Шынкар, А. Шумейка, Я. Яловічава.

III. **Граматамі ЦК ЛКСМБ**—Л. Брыгадзіна, Т. Глушакова, А. Каракін, А. Тозік.

Студэнты, працы якіх аднесены да другой катэгорыі, узнагароджваюцца:

I. **Граматамі Міністэрства** — А. Варрава, Г. Елісеенка, В. Карась, І. Каржыцкая, К. Кустоў, В. Міхайлішын, М. Руновіч, В. Салыніна, А. Чумакоў.

II. **Граматамі ЦК ЛКСМБ** — С. Алексіевіч, Л. Дзмітрыева, В. Лук'яненка, Э. Мельнікаў, М. Скакун.

Міністэрства ўзнагародзіла таксама граматамі прафесара У. М. Сікорскага, дацэнтаў Т. І. Прытыцкую (старшыня журы конкурсу), П. У. Грышановіча, П. П. Сіліванчыка, С. Я. Янчанку, ст. выкладчыка М. І. Іоську. Падзяка аб'яўлена лабаранткам В. Ш. Валіулінай (кафедра гісторыі КПСС) і В. С. Дуднікавай (кафедра палітэканоміі).

Яшчэ некалькі год назад на старонках маладзёжных часопісаў ішлі гарачыя спрэчкі наконт мэтазгоднасці шырокага прыцягнення студэнтаў да навуковых даследаванняў па праблемах грамадскіх дысцыплін.

Бясспрэчна, сцвярджалі некаторыя, студэнцкія тэхнічныя лабараторыі, канструктарскія бюро добра зарэкамендавалі сябе, але даследаванні ў галінах філасофіі, гісторыі — гэта другая справа, тут патрэбны гады спецыяльнай падрыхтоўкі...

Само жыццё падказала правільнае рашэнне. Вось ужо другі год у краіне паспяхова праводзяцца аглядыконкурсы студэнцкіх навуковых работ. У іх удзельнічаюць дзесяткі тысяч юнакоў і дзяўчат, многія з якіх паказалі сябе сур'ёзнымі і ўдумлівымі даследчыкамі, здольнымі да навуковай працы. Аб гэтым сведчаць і вынікі нядаўняга беларускага агляду. У ім прыняло ўдзел звыш 1800 чалавек, а калі ўлічыць выступаўшых па дакладах на канферэнцыях, то з упэўненасцю можна сказаць, што ўжо амаль палова беларускага студэнцтва праявіла вялікую цікавасць да глыбокага вывучэння і даследавання актуальных і складаных праблем гісторыі і іншых грамадскіх навук.

Як і ў мінулым годзе, на нядаўнім рэспубліканскім аглядзе наш універсітэт заняў вядучае месца. Вышэйшыя навучальныя ўстановы Беларусі адабралі на рэспубліканскі конкурс 410 лепшых прац студэнтаў, з іх 64 былі аднесены да першай катэгорыі. Пятнаццаць належаць універсітэцкім аўтарам. Па асобных галінах навук працэнт заваяваных першых месц яшчэ больш высокі. Скажам, па філасофіі — каля паловы, па навуковаму камунізму — трыццаць працэнтаў і г. д.

Сярод аўтараў-пераможцаў мы сустракаем і ветэранаў традыцыйнага конкурсу і навічкоў. І разам з тым для універсітэта гэты год асабліва характэрны шырокім удзелам у аглядзе першакурснікаў. Восем іх прац аднесена да першай і другой катэгорый. Па палітэканоміі, напрыклад, з чатырох работ першай катэгорыі тры належаць першакурснікам. Прычым тэмы іх даследаванняў даволі складаныя. Паглядзіце самі: «Навукова-тэхнічная рэвалюцыя і яе сацыяльныя вынікі (на прыкладзе ФРГ)», аўтар — студэнтка першага курса аддзялення палітэканоміі юрыдычнага факультэта Наталля Абрамава; «Капіталістычная нацыяналізацыя, метады яе ажыццяўлення і сацыяльна-эканамічныя вынікі (на прыкладзе асобных развітых краін)» (студэнт першага курса аддзялення палітэканоміі Аляксандр Вараб'ёў); «Абсалютная зямельная рэнта на сучасным этапе» (студэнт першага курса аддзялення філасофіі Анатоль Злотнікаў). Да першай катэгорыі рэспубліканскае журы аднесла працу студэнткі першага курса хімфака Святланы Абуладзе «Карл Маркс і рэвалюцыйны рух у Расіі», да другой — «Формы ваенна-патрыятычнага выхавання (па матэрыялах Савецкага раёна горада Мінска)» першакурсніка Мікалая Руновіча, «Камсамольска-маладзёжны друк Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны» студэнткі першага курса журфака Святланы Алексіевіч, «Гісторыя стварэння газеты «Чырвоная змена» і яе роля ў ідэйна-палітычным выхаванні моладзі (1921—1925 гг.)» Эдуарда Мельнікава, «Ленін і камсамол» першакурсніка Віктара Лук'яненкі. Згадзіцеся — выдатная заяўка! Ад усёй душы віншуем іх, жадаем новых поспехаў і заклікаем цяперашніх першакурснікаў паследаваць іх прыкладу.

Нам прыемна таксама павіншаваць Ліду Брыгадзіну з філфака, Юрыя Шынкара і Міхаіла Віннікава з філасофскага аддзялення—ветэранаў рэспубліканскіх аглядаў. А вось імёны астатніх студэнтаў, працы якіх таксама аднесены да першай катэгорыі, — Аня Селязнёва (4 гістфак, вячэрніца), Аляксандр Залатухін (3 гістфак), Людміла Анціпіна (2 філфак), Анатоль Тозік (2 гістфак), Людміла Трухава (3 гістфак), Андрэй Каракін (2 гістфак), Таня Глушакова (3 гістфак), Аляксандр Байчароў (2 філасофскі), Віктар Колесаў (6 курс аддзялення філасофіі завочнага факультэта), Лілія Ніціеўская (2 курс аддзялення палітэканоміі), Аляксандр Багачоў (6 курс аддзялення філасофіі завочнага факультэта), Ядзвіга Яловічава (4 геолага-геаграфічны), Аляксандр Шумейка (4 гістфак). Усе яны, акрамя В. Колесава і А. Багачова, якія ўжо закончылі універсітэт, цяпер сталі на адзін курс старэйшымі, і можна спадзявацца, што яшчэ не раз парадуюць сваіх выкладчыкаў, бацькоў і сяброў поспехамі ў навукова-даследчай рабоце. Дарэчы, іх дасягненні, адносіны да вучобы факультэты павінны прапагандаваць не менш шырока, чым гэта мы ўмеем рабіць у адносінах да спартсменаў. Ва універсітэце гэтай справе яшчэ мала ўдзяляецца ўвагі.

З вышэй сказанага можна зрабіць і іншыя важныя вывады. Сярод студэнтаў, навуковыя працы якіх аднесены да першай катэгорыі, вельмі мала прадстаўнікоў прыродазнаўчых факультэтаў: з пятнаццаці толькі два.

Трэба таксама адзначыць і такія ўпушчэнні. Пакуль што многія выкладчыкі-філосафы, гісторыкі, юрысты, эканамісты слаба ўдзельнічаюць у арганізацыі даследаванняў студэнтаў. Вось аб чым гавораць факты. Калі прафесар У. М. Сікорскі, загадчык кафедры гісторыі КПСС, кіраваў даследчай працай пяці студэнтаў, работы якіх аднесены да першай катэгорыі, то ўсе філосафы універсітэта падрыхтавалі толькі тры работы першай катэгорыі.

У студэнцкіх даследаваннях усё яшчэ мала месца займае беларуская тэматыка.

Можна было б спаслацца і на другія ўпушчэнні партыйных, камсамольскіх арганізацый, выкладчыкаў факультэтаў у развіцці навукова-даследчай работы студэнтаў, але памеры артыкула не дазваляюць гэта зрабіць. У пачатку лістапада адбудзецца рэспубліканская студэнцкая навуковая канферэнцыя па выніках конкурсу. Яе арганізатары і кіраўнікі падрабязна прааналізуюць і поспехі і недахопы ў гэтай справе. Хочацца спадзявацца, што на ўсіх факультэтах нашага універсітэта будзе абмеркавана становішча ў развіцці навукова-даследчай працы студэнцтва. Накоплены станоўчы вопыт патрабуе ісці далей.

М. РЭГІСТАНАЎ.

«ХРЫШЧЭННЕ» ПЕРШАКУРСНІКАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Каб не гудзелі:
«Надакучыў!»—
Яшчэ скажу вам пару
слоў:
Калі б мне нанава
радзіцца,
То і тады рашыў бы так:
Калі ісці куды вучыцца,
Дык толькі, браткі, на
філфак!

Сяргея сустрэлі цёпла, дружнымі воплескамі. Яго, члена «Узлёту», здольнага паэта на факультэце ведаюць усе.! Не менш ведаюць і паважаюць Мар'яна Дуксу — сёлетняга выпускніка. Ён — прызнаны факультэцкі «класік»: летась у выдавецтве «Беларусь» выйшаў зборнік яго вершаў «Спатканне». Таму зразумела, з якой увагай слухаюць першакурснікі свайго старэйшага таварыша:

Ну вось, нарэшце, і
збылося,
Адбыўся ў нейкай меры
цуд.
Перагуло, ператраслося,
І, калі ласка,—усе вы
тут.
І вам, відаць, на першым
курсе
Вітаць патрэбна добры
лёс,
Што вас сюды цыбаты
бусел
У пачатку верасня прынёс.
Ісці ў гуманітарны
Было, нібы праз цёмны
лес.
Ці ж вінаваты вы, што
конкурс,
Як на дражджах, угору
лез?!..
Дзень добры, землякі і
цёзкі,
Сыны правінцыі лясной!
А можа, вы з суседняй
вёскі?
А можа, з вуліцы маёй?
Жывіце! Мы ўжо
адкружылі,
А вам — філфаку
памагчы.
А мы... ну, што мы?
Старажылы!—
Перадаем свае ключы.
І вы, як вопыт учарашні,
Сабе кладзіце у кішэнь
Такія запаветы нашы —
Спатрэбяцца на «чорны»
дзень:
— Ты на руках Гамера
гушкай,
Пелееў сын, загінеш ты.
Але не плач, як станеш
птушкай,—
Як «крылы» будуць і
«хвасты».
— У кубавую за вараткам
Спускайся, нібы марафон,
Калі казённая трыццатка
Адыдзе у дзяржаўны
фонд.
— Калі ўжо выбухнула
драма,
На пошту раніцай бяжы
І напішы: «Калі ты
мама,—
Не цырымоніся, памажы!»
— Парваліся ж дарэшты
«шлюткі»,
Балонню хоць ты не
нясі —
І дзядзьку роднага, і
цётку
Патармасі, патармасі.
— Не згінь душою за
адзнаку,
Вачэй не псуй ты па
начах,
Каб быў заўжды студэнт
філфака
Не буквагрыз і не
манах..

«Запаветы» ўспрымаюцца як і трэба: з усмешкай на тварах, са зразумелай «папраўкай» на гумар. У адказ— вершы першакурсніцы Александровіч, а пасля студэнткі аддзялення рускай мовы і літаратуры зачытваюць «Клятву першакурснікаў». Услед за імі гэтую гумарыстычную клятву паўтараюць дзвесце юнакоў і дзяўчат:

Клянёмся первым днём
творенья,
Клянёмся и последним
днём:
Всю жизнь мы посвятим
ученью,
А остальное на потом!
Клянёмся, что будем мы
помнить всегда:
Учение — свет!
Неучение — тьма!
Клянёмся, что, если к нам
лень подойдёт,
Мы лени всем курсом
объявим бойкот!
А если вдруг (о муки
ада!)
Амуры нам объявят бой,
То мы латынь зубрить
засядем —
Любовь уйдет сама
собой.
Клянёмся, когда к нам
экзамен придёт,
Шпаргалкам дадим от
ворот поворот!
Клянёмся мы, пока горим,
С пути сметём и лёд, и
камень —
Тебе, филфак наш,
посвятим
Своих сердец горячий
пламень!

Святочны рытуал заканчваецца ўручэннем студэнцкіх білетаў і заліковак. Свята закончылася, а святочны настрой будзе яшчэ доўга адчувацца: і ў аўдыторыях, і ў інтэрнаце. Пройдзе час — і сёлетнія першакурснікі самі ў гэткую ж пару будуць вітаць новае студэнцкае папаўненне, вітаць ад імя паўнамоцных гаспадароў факультэта.

Вось расказаў пра гэты няхітры рытуал свята філалагічнага факультэта — і адразу падумалася: а чаму б такое свята не зрабіць традыцыйным для ўсяго універсітэта?

В. РАГОЙША,
ст. выкладчык кафедры беларускай літаратуры.

ЯК РАСТУЦЬ «ХВАСТЫ»

ПРАБЛЕМЫ СТУДЭНЦКАГА ЖЫЦЦЯ.

Іх пазнаеш адразу, хоць, на першы погляд, яны нічым не адрозніваюцца ад іншых. І толькі падручнікі і канспекты, у якія яны раз-пораз заглядваюць на хаду, ды засмучанасць у вачах беспамылкова падкажуць, што над імі ўжо некалькі месяцаў, як дамоклаў меч, вісіць цяжар «хваста». І адчуваеш, нібы частка гэтага цяжару навалілася і на цябе, але нічым, акрамя спачувальнага позірку і некалькіх падбадзёрваючых слоў, дапамагчы ўжо не можаш.

... Мы прыйшлі ў мінулым годзе ў аўдыторыі факультэта журналістыкі, атрымаўшы прыкладна роўную колькасць балаў на ўступных экзаменах. А пасля летняй экзаменацыйнай сесіі пятая частка студэнтаў нашага курса (16 чалавек) несла груз нездавальняючых адзнак. Трое — Шукайлаў, Чыркіна і Купрыенка — выключаны за акадэмічную непаспяховасць.

Усе мы паступілі з радаснымі надзеямі на будучыню. Кожны быў упэўнен, што будзе атрымліваць толькі добрыя і выдатныя адзнакі. Аднак да здзяйснення гэтай мэты падышлі па рознаму. Адны зрабілі акцэнт на самастойную работу, паклаўшы ў аснову лекцыі выкладчыкаў, другія, наадварот, самастойна не працавалі, палічыўшы, што дастаткова адных лекцый. Былі і трэція, якія ўскладалі ўсе надзеі на «як-небудзь».

На сесіях, адпаведна, першыя атрымалі добрыя і выдатныя адзнакі, другія — ледзь-ледзь вылазілі на здавальняюча, а трэція... Трэція спачатку «як-небудзь» дабіваліся для сябе адцягнення тэрміну здачы экзамена, стараючыся за некалькі дзён ахапіць неабсяжнае, потым «як-небудзь» угаварвалі выкладчыка дазволіць ім здаваць яшчэ раз, а калі і гэта спроба не прыносіла ім здавальняючай адзнакі, папаўнялі рады «хвасцістаў» і са стогнам садзіліся на два месяцы за сур'ёзную сістэматычную працу.

Але самае дзіўнае, нават парадаксальнае, тое, што гэтыя «хвасцісты» добра разумеюць, што журналіст павінен мець энцыклапедычныя веды, інакш вышэй пустазвона ён не падымецца. Разумеюць, а нічога не робяць. Ну як тут не ўспомніць Ілью Ільіча Абломава, які таксама ведаў, што жыць так, як жыве ён,—нельга. Але што ж ад гэтага змянілася?

Вядома, што ў душы кожнага чалавека ў якойсьці меры ідзе барацьба паміж «не хачу» і «трэба». Аднак вынік гэтай барацьбы залежыць толькі ад яго духоўных сіл, ад сілы яго волі.

Многія скажуць, што я «згусціў фарбы», што ўсё значна прасцей і прычына «хвастоў» на другім курсе журфака ў... беларускай мове, якую многія не вывучалі ў сярэдняй школе і якую «фізічна немагчыма вывучыць за год». У адказ я магу прывесці шмат прыкладаў, як многія студэнты нашага курса пераадолелі гэта «фізічна немагчымае». Спытайце ў Наташы Цімафеевай або ў Эдуарда Мельнікава, як «добра» яны ведалі беларускую мову да паступлення ва універсітэт. А цяпер яны свабодна валодаюць ёю.

...Вядома, вельмі цяжка, амаль немагчыма засвоіць падрабязна ўсю новую навуковую інфармацыю, атрыманую ў час лекцый і самастойных заняткаў. Але ўзяць галоўнае ў прачытаным курсе не толькі магчыма, але і неабходна.

Толькі рабіць гэта трэба з першага дня.

М. ТОЛСЦІК,
студэнт журфака.

ШЧАСЛІВАГА ДАЎГАЛЕЦЦЯ, ЮБІЛЯРЫ!

У гэтыя дні гістарычны факультэт урачыста адзначае юбілей сваіх старэйшых выкладчыкаў — прафесара Рыгора Маркавіча Трухнова і дацэнтаў Марыі Беніамінаўны Фрыдман і Марыі Парфір'еўны Баранавай. Рэдакцыя далучаецца да сардэчных віншаванняў імяніннікаў і жадае ім новых поспехаў у навукова-даследчай, педагагічнай рабоце, шчаслівага даўгалецця. Ніжэй змяшчаюцца кароткія расказы аб жыцці і дзейнасці юбіляраў.

РЫГОР МАРКАВІЧ ТРУХНОЎ — прадстаўнік старэйшага пакалення гістфакаўцаў, які ўжо каля 30 год працуе на нашым факультэце. Яго біяграфія нічым не адрозніваецца ад біяграфій тых людзей, якія пачалі сваё свядомае жыццё пасля Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, і разам з тым яна незвычайная. Сын вясковага працаўніка, ён, вельмі рана застаўшыся без бацькі, атрымаў вышэйшую адукацыю, стаў дацэнтам, затым і доктарам навук, прафесарам.

Ужо многа год Рыгор Маркавіч чытае курсы па новай і навейшай гісторыі краін Афрыкі і Азіі, навейшай гісторыі Заходняй Еўропы і ЗША, вядзе спецсемінары. Яго лекцыі вызначаюцца багатым зместам, высокай ідэйнасцю, заўсёды эмацыянальна афарбаваны і таму карыстаюцца вялікай папулярнасцю ў студэнтаў. Прафесар Р. М. Трухноў — адзін з вядомых прадстаўнікоў савецкай школы германістаў. Яго пяру належаць такія даследаванні, як «Германскае пытанне на Лонданскай рэпарацыённай канферэнцыі 1924 года», «Рэвалюцыйны ўздым у Германіі (1918—1921 гг.)», «Палітыка германскага інперыялізму ў час першай Балканскай вайны» і іншыя. Хутка выйдзе з друку яшчэ адна манаграфія— «Барацьба класаў і партый у Германіі». Вучоным напісана таксама вялікая колькасць артыкулаў, якія апублікаваны ў «Вучоных запісках» БДУ, грамадска - палітычных часопісах, рэспубліканскіх газетах.

Як педагог, Рыгор Маркавіч кіруе навуковай працай студэнтаў і аспірантаў. Яго вучні вядуць самастойную навуковую і педагагічную працу ў розных кутках Беларусі.

Хацелася б спыніцца яшчэ на некаторых баках багатай біяграфіі гэтага сціплага чалавека. Рыгор Маркавіч — актыўны ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Радзіма адзначыла яго баявыя подзвігі чатырма ордэнамі, медалямі. Прафесар часта выступае перад насельніцтвам рэспублікі з расказамі аб гераічнай барацьбе беларускага народа супраць нямецка - фашысцкіх захопнікаў, аб уроках гісторыі. Ён вядзе вялікую грамадска - палітычную работу ў сценах універсітэта і за яго межамі.

Прафесару Рыгору Маркавічу Трухнову споўнілася 60 год.

Е. ДАЎГУЧЫЦ,
ст. выкладчык кафедры новай гісторыі.

* * *

МАРЫЯ БЕНІАМІНАЎНА ФРЫДМАН. якой споўнілася таксама 60 год, прыйшла ў наш універсітэт у 1926 годзе. Яна была ў ліку першых выпускнікоў гістарычнага аддзялення педфака. Сваю працоўную дзейнасць Марыя Беніамінаўна пачала лабарантам на рабочым факультэце, а хутка яе назначылі старшым выкладчыкам гісторыі СССР Камвуза і педінстытута горада Віцебска. На гэтай пасадзе і застала яе вайна. Знаходзячыся ў эвакуацыі, М. Б. Фрыдман выкладае гісторыю ва Ульянаўскім педінстытуце, працуе лектарам гарадскога і абласнога камітэтаў партыі. У выдадзенай ёй у той час характарыстыцы адзначаецца, што выкладчык не шкадавала сваіх сіл і здароўя для мабілізацыі працоўных на хутчэйшы разгром ворага, яе палымянае бальшавіцкае слова гучала ў студэнцкіх аўдыторыях і на заводах, у калгасах і чырвонаармейскіх падраздзяленнях.

У 1944 годзе Марыя Беніамінаўна вяртаецца ў родны універсітэт. Вось ужо чвэрць стагоддзя яна дацэнт нашага факультэта. Многа працы і энергіі ўкладвае Марыя Беніамінаўна ў падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў—гісторыкаў. Сотні яе вучняў актыўна ўдзельнічаюць у камуністычным будаўніцтве не толькі на Беларусі, але і амаль што ва ўсіх рэспубліках краіны. Усе яны з удзячнасцю адзываюцца аб высакароднай і пачэснай працы нашага юбіляра.

Тры дзесяцігоддзі Марыя Беніамінаўна—у радах Камуністычнай партыі. Многа партыйных даручэнняў выканала яна за гэты час, шмат зрабіла і для навукі. Няма магчымасці пералічыць усё, што выйшла з-пад яе пяра. Дастаткова толькі прыгадаць, што яна з'яўляецца першым даследчыкам гісторыі грамадскага руху на Беларусі і ў прыватнасці, руху дзекабрыстаў. М. Б. Фрыдман — прызнаны спецыяліст па гісторыі адмены прыгоннага права на Беларусі. Для нас, Вашых шматлікіх вучняў, заўсёды прыкладам з'яўляецца Ваша працавітасць, навуковая добрасумленнасць і прынцыповасць, чулыя адносіны да кожнага.

Дазвольце, Марыя Беніамінаўна, ад шчырага сэрца падзякаваць за Вашу доблесную працу, павіншаваць з юбілеем і пажадаць добрага здароўя, бадзёрасці і доўгіх год жыцця!

А. ІГНАЦЕНКА,
дацэнт, кандыдат гістарычных навук.

* * *

МАРЫЯ ПАРФІР'ЕЎНА БАРАНАВА — выхадзец з працоўнай сям'і. У 18 год яна пачала настаўнічаць. Затым цяга да ведаў прывяла дзяўчыну ва універсітэцкія аўдыторыі. Калі да заканчэння гістарычнага факультэта заставаўся адзін год, выбухнула вайна. Апынуўшыся на Урале, Марыя Парфір'еўна аддавала ўсе свае сілы і веды падрыхтоўцы маладога пакалення да жыцця і барацьбы. Ад радавой настаўніцы яна вырасла да дырэктара буйнай сярэдняй школы. Пачэсная праца настаўніцы была адзначана Ганаровай граматай Свярдлоўскага аблвыканкома, а Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР узнагародзіў медалем «За доблестный труд в Великой Отечественной войне».

У 1943 годзе М. П. Баранава — на станцыі Сходня пад Масквой, дзе ўзнавіў сваю работу Беларускі дзяржаўны універсітэт. Гэта быў складаны і цяжкі час. Мы ганарымся, што простая аршанская дзяўчына мужна пераадолела ўсе перашкоды і ў 1944 годзе закончыла ўніверсітэт з дыпломам выдатніка. Для гэтага, акрамя вялікіх здольнасцей, патрэбна была незвычайная сіла волі.

Будучы ў аспірантуры, Марыя Парфір'еўна пачала сваю выкладчыцкую дзейнасць ва універсітэце. Менавіта з 1945 года і датуецца пачатак навуковай і педагагічнай працы М. П. Баранавай у вышэйшай школе. Але яна не парывае сваіх цесных сувязей са звычайнай школай. Па падручніку дацэнта ўжо многа год запар вывучаюць гісторыю ў школах беларускія дзеці, а вучэбна-метадычнымі дапаможнікамі паўсядзённа карыстаюцца настаўнікі рэспублікі.

Марыя Парфір'еўна ўмее тонка, педагагічна вусным і друкаваным словам прывіваць любоў да сваёй Радзімы, гонар за яе поспехі. Равесніца рэспублікі, Марыя Парфір'еўна Баранава сустракае свой юбілей у росквіце сіл. Яна прынясе яшчэ многа добрага і карыснага свайму народу. Грамадскасць факультэта віншуе і жадае ёй плённай працы.

А. КАЖУШКОЎ,
дацэнт, кандыдат гістарычных навук.

ДЗЕЛЯ ЖЫЦЦЯ НА ЗЯМЛІ

Кафедра рускай савецкай літаратуры і бібліятэка праводзяць літаратурную канферэнцыю пад дэвізам «Дзеля жыцця на зямлі», якая прысвячаецца 50-годдзю ВЛКСМ.

Канферэнцыя адбудзецца 22 кастрычніка ў чытальнай зале універсітэцкай бібліятэкі а 18-й гадзіне.

З першых дзён старанна працуюць у лабараторыях першакурснікі хімічнага факультэта. Тут яны замацоўваюць веды, якія атрымалі на лекцыях.

На здымку: старшая лабарантка кафедры неарганічнай хіміі Маргарыта Паўлаўна **Прановіч** дапамагае першакурсніцы Тамары **Харкевіч** падрыхтавацца да практычных заняткаў.

Фота **І. Аскіркі.**

Да 50-годдзя ВЛКСМ

У ГОНАР СВЯТА

Камсамольцы універсітэта дзейсна рыхтуюцца да свайго вялікага свята — 50-годдзя Ленінскага камсамола.

Гэтаму юбілею прысвячаюцца фотавыстаўкі і канферэнцыі, спецыяльныя выпускі насценных газет. Калектывы мастацкай самадзейнасці рыхтуюць святочныя канцэртныя праграмы.

Не застаюцца ў баку і спартсмены. У гонар свята адбываюцца цікавыя спартыўныя спаборніцтвы, у якіх юнакі і дзяўчаты дэманструюць сваё майстэрства, волю да перамогі, жаданне прынесці сваім калектывам заслужаны поспех.

У гонар свята праходзіў сёлета і традыцыйны асенні крос. Нягледзячы на дажджлівае надвор'е, лёгкаатлеты з розных факультэтаў паказалі нядрэнныя вынікі.

Асаблівую арганізаванасць і напорыстасць выявілі журналісты, гісторыкі, матэматыкі. Яны і занялі адпаведна першыя тры месцы. За імі ідуць філолагі, географы і геолагі, юрысты, фізікі, біёлагі, хімікі.

І. СЯМКОЎ.

ЗАПРАШЭННЕ ДА ПОШУКАЎ

БЕЛАРУСКАЯ НЕЗНАЁМКА

Доўгі час жыхары горада Астрагожска не ведалі, чый партрэт упрыгожвае іх карцінную галерэю — строгі задуменны твар жанчыны не даваў спакою ні наведвальнікам, ні мастакам. Потым было ўстаноўлена, што гэта работа належыць рускаму партрэтысту Шчарбатаву. Архівы падказалі і прозвішча гераіні. Незнаёмкай аказалася наша зямлячка Варвара Кашаварава-Руднева.

Вось што пісалі аб ёй пецярбургскія газеты сто гадоў назад: «Калі назвалі яе імя, гром апладысментаў запоўніў залу, шум працягваўся некалькі мінут. А калі ўручэнне дыпломаў закончылася, таварышы пасадзілі яе ў крэсла і з усхваляванымі воклічамі пранеслі па ўсіх залах...» Гэта адбылося на выпускным вечары Медыка-хірургічнай акадэміі.

Варвара нарадзілася ў беднай беларускай вёсцы, вельмі рана засталася сіратой. Нягоды не маглі перашкодзіць імкненню дзяўчынкі да ведаў. У чатырнаццаць год яна пачала вучыцца грамаце. Хутка былі прачытаны ўсе кнігі, якія меліся ў вёсцы. Як быць далей? Варвара тайна, падобна Міхайле Ламаносаву, пакідае родныя мясціны і накіроўваецца ў сталіцу. Адказ, усюды адказ — «Навука не для жанчын».

Дзяўчына прыязджае ва Уральскае войска і некалькі год працуе медыцынскай сястрой. Цяпер яна зразумела, што без прафесіі ўрача жыць не можа. Адно прашэнне за другім пасылае Варвара ў Пецярбург. Упорства беларускай дзяўчыны перамагае — яе залічваюць у Медыка-хірургічную акадэмію, якую яна скончыла з залатым медалем.

Варвара Аляксандраўна атрымлівае вучоную ступень доктара медыцыны. Аб яе навуковых працах гавораць медыкі ўсяго свету. Хутка яна выязджае ў Парыж, дзе чытае навуковыя даклады спецыялістам, студэнтам. Тады і нарысаваў яе Шчарбатаў.

Вярнулася Руднева дамоў з жаданнем аддаць усе свае веды народу, але дзверы навуковых установаў Расіі перад жанчынай былі закрыты. Фельетаністы і карыкатурысты Пецярбурга напераганкі стараліся ачарніць добрае імя беларускага вучонага. З болем у сэрцы Варвара Аляксандраўна піша ў сваім дзённіку: «Ці правільна, што дыплом, для атрымання якога я згодна была ахвяраваць сваім жыццём, на які я патраціла столькі працы, энергіі, сілы волі, не дае мне права аддацца іменна той справе, для якой былі зроблены ахвяры...»

Кашаварава-Руднева пераехала ў правінцыяльны гарадок Старую Русу і да канца свайго жыцця працавала тут урачом.

Хочацца звярнуцца да студэнтаў-журналістаў, гісторыкаў: займіцеся пошукамі, стварыце летапіс жыцця «беларускай Ламаносавай». Подзвіг, жыццё Варвары Аляксандраўны заслугоўваюць таго, каб аб іх ведалі беларусы.

С. РУСЕЦКІ.

ПРАФСАЮЗНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

24 кастрычніка ў актавай зале галоўнага корпуса адбудзецца прафсаюзная канферэнцыя прафесарска-выкладчыцкага саставу і супрацоўнікаў універсітэта.

У павестку дня ўваходзяць справаздачы аб рабоце мясцкома і рэвізійнай камісіі (дакладчыкі І. Т. Рагоўскі і А. Н. Нахімоўская), а таксама выбары новага саставу мясцкома і рэвізійнай камісіі.

Пачатак работы канферэнцыі а 14-й гадзіне.

Адказны рэдактар М. ІОСЬКА.

АТ 02435. Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон—Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. 1788.